УДК 821.161.3:82-2Дунін-Марцінкевіч

**В. А. Сянчыла**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

# ВОБРАЗ АЎТАРА Ў ПАЭЗІІ ВІНЦЭНТА ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА

**Уводзіны.** У нашай свядомасці даволі трывала ўсталяваўся вобраз Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча як выдатнага драматурга, за якім мы можам назіраць у яго даволі яскравых і насычаных п’есах. Аднак яго творчая асоба выявілася і ў пранікнёнай лірыцы, у вершаваных апавяданнях і аповесцях. Паўнацэнная карціна творчасці літаратара немагчыма без аналізу вобраза аўтара. Якраз гэта катэгорыя раскрывае ідэйна-эстэтычныя пазіцыі творцы. Таму засяродзімся на вобразе аўтара ў паэтычнай спадчыне славутага майстра беларускага і польскага слова.

**Асноўная частка.** У «Гісторыі беларускай літаратуры: XIX — пачатак XX ст.» адзначаецца, што «творчая дзейнасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча разгарнулася ў перыяд станаўлення новай беларускай літаратуры. Сваімі вытокамі яна цесна звязана з агульнай актывізацыяй грамадскай думкі ў сярэдзіне XIX стагоддзя, абуджэннем нацыянальнай свядомасці прыгоннага сялянства і перадавых слаёў інтэлігенцыі пераважна шляхецкага паходжання. Дзейнасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча як пачынальніка і пракладчыка новых шляхоў у літаратуры была для тагачаснай Беларусі з’явай шмат у чым наватарскай, выключна плённай і перспектыўнай. Вось чаму значэнне літаратурнай спадчыны Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча з гадамі няўхільна ўзрастае — для кожнага новага пакалення беларускіх пісьменнікаў і чытачоў яна з’яўляецца ўзорам самаадданай працы на карысць роднага народа і яго духоўнай культуры» [1, с. 61].

Калі разглядаць вобраз Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча як лірыка, то перад намі паўстае вобраз паэта. Вядомы літаратуразнавец Вячаслаў Рагойша вызначае паняцце «вобраз паэта» наступным чынам: «Вобраз паэта — умоўны тэрмін, якім абазначаюць вобраз, што ўзнікае ў свядомасці чытача ў выніку знаёмства з лірычнай творчасцю таго ці іншага паэта. Лірык выяўляе ў вершах свае думкі і пачуцці, настрой і перажыванні, свае адносіны да з’яў і падзей навакольнай рэчаіснасці. Але формы гэтага выяўлення могуць быць розныя, падчас нечаканыя» [2, с. 47].

Міхаіл Лазарук сцвярджае: «Вобраз аўтара — вобраз-характар, які ўзнікае з асаблівасцей мовы апавядальніка, не звязанай з мовай якога-небудзь з персанажаў або аўтарскай мовай у эпічных, а таксама ў ліра-эпічных творах (у драматургіі мова аўтара выяўляецца толькі ў рэмарках, якія на сцэне не гучаць). Вобраз аўтара можа быць набліжаны да асобы аўтара або значна адрозны. Нават калі гэты вобраз і не персаніфікуецца як апавядальнік, як удзельнік або сведка падзей, ён прысутнічае ў творы. У мове, якой вядзецца апавяданне, узгадваецца асоба пэўнага ўзроўню культуры, сацыяльнага асяроддзя, пэўных адносін да жыцця. Вобраз аўтара ў аднаго і таго ж пісьменніка можа быць не аднолькавы» [3, с. 38].

Для Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча родны край— гэта не толькі пейзаж або мясціна, а гэта яшчэ і гісторыя яго сям’і, рода ўвогуле: *«О, магіла бацькоў! — любых продкаў сядзіба! // Я вітаю цябе, мая родная скіба!»* [4, с. 154].

Ва ўступных радках да вершаванага апавядання «Благаславёная сям’я» аўтар таксама выказвае не толькі сваю пашану роднаму краю, але і тое, што ён ніколі не забудзе гэтыя мясціны, і што яны назаўсёды знайшлі адбітак у яго сэрцы, жыцці і творчасці: *«Я душою твае бачу ціхія нівы // І прыгадаю час — час мінулы, шчаслівы!»* [4, с. 154]. Вобраз паэта праяўляецца ў выказванні любові да роднага краю. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч узвышае свой родны кут над сусветнымі сталіцамі. Аўтар захапляецца краявідамі роднай старонкі: *«Маладыя гады ў думках я ўспамінаю, // Бо ўздыхаць на ўвесь свет не люблю, не жадаю, // Што мне пекны Парыж, Рым прыгожы і слынны, // Што мне швейцарскія горы, старыя Афіны. // Што мне Вена, Мадрыд, што мне Лондан туманны, // Больш за ўсё я бацькоўскаму краю адданы!»* [4, с. 154].

Каб надаць роднаму краю большую значнасць і засярoдзіць увагу чытача на самім месцы, дзе аўтар адчувае асалоду ад знаходжання менавіта ў гэтым краі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевач выкарыстоўвае анафару, а наяўнасць вялікай колькасці клічнікаў яшчэ раз паказвае чытачу, наколькі для паэта важная Бацькаўшчына: *«Тут нявеста, што болей не знойдзеш вярнейшай! // Тут дзяўчына, што ў свеце няма прыгажэйшай. // Тут ёсць праўда і шчырасць, тут людзі з душою! // Тут бацькоў маіх прах пад сырою зямлёю!»* [4, с. 154].

Любоў да Радзімы — не адзіны бок вобраза паэта, які паўстае перад намі ў «Благаславёнай сям’і». Таксама вобраз аўтара выяўляецца ў апісанні прыкладнай беларускай сям’і: *«Узвышаўся над Свіслаччу, ціхай ракою // Панскі домік калісь, повен шчасця й спакою, // І жыла ў ім сям’я — прыклад для сем’яніна: // Бацьку сын шанаваў, паважаў бацька сына»* [4, с. 154—155].

Як мы ведаем, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч паходзіў са збяднелай шляхты, сам пракладаў жыццёвы і творчы шлях, некаторая аўтабіяграфічнасць выяўляецца ў яго творы «Благаславёная сям’я»: *«Родам з шляхты збяднелай, ад бацькоў сам убогіх, // Ў бітвах з лёсам сабе пракладаў ён дарогі, // І праклаў іх нарэшце, вось божае дзіва!»* [4, с. 156].

© Сянчыла В. А., 2020



Рэпазіторый БарДУ

Вядомы даследчык і літаратуразнаўца Віктар Іванавіч Яцухна сцвярджае: «Асаблівую ролю ў стварэнні мастацкага вобраза адыгрывае ўяўленне творцы. Уяўленне мастака — гэта не толькі псіхалагічны стымул яго творчасці, але і нейкая дадзенасць, якая мае месца ў творцы. У апошнім з дапамогай вымыслу прысутнічае прадметнасць, якая часам не мае сабе адпаведнасці ў рэальным жыцці. Дамінаванне ў мастацкай тканіне твора рэальнага альбо вымышленага дае падставы вучоным весці гаворку аб жыццепадобнасці альбо ўмоўнасці адлюстраванага» [5, с. 50].

Уладзіслаў Сыракомля адыгрываў важную ролю не толькі ў жыццёвым, але і ў творчым шляху Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Таму мы можам убачыць вобраз аўтара нават у імёнах галоўных герояў у такім вершаваным апавяданні, як «Благаславёная сям'я»: *«Як яна ўпершыню* ***Ўладзіслава*** *спаткала, // Дык адчула, як сэрца па-іншаму б'ецца, // Пачуццём незнаёмым ахоплена сэрца»* [4, с. 157], а таксама «Літаратарскія клопаты», якое ўвогуле прысвечана Уладзіславу Сыракомлю, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч ставіць яго ў прыклад: *«Фэ! З крыўдай кнігароў пан хоча стаць багатым. // Яшчэ каб пан быў модны, як той* ***Сыракомля****, // Каб славіўся пісаннем з Вільні аж да Гомля…»* [4, с. 171].

Вобраз аўтара ў паэзіі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча праяўляецца і ў яскравай насычанасці яго вершаў самымі разнастайнымі сродкамі мастацкай выразнасці. Так, напрыклад, у вершы «Прыпяць» паэт персаніфікуе рэчку, каб надаць вершу большай лірычнасці і чуласці, аўтар паказвае, што Прыпяць быццам бы свядома выбірае свой шлях: *«Адвечна каханне іх рушыць, яднае, // Хоць Прыпяць у хвалях дняпроўскіх канае. // Яна, праплываючы шлях свой далёкі, // Свядома да смерці прыспешвае крокі»* [6, с. 348]. Таксама ў гэтым вершы праяўляюцца непасрэднасць і любоў да жыцця класіка беларускай літаратуры: *«І дух яе мкнецца па шляху жыццёвым, // Усмешка на вуснах, пяшчотныя словы. // Хвілінка кахання, ясноты і згоды // Куды даражэй нам за нудныя годы»* [6, с. 349].

Яшчэ адна асаблівасць паэзіі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, у якой мы можам заўважыць вобраз аўтара, — радкі з рэлігійнымі матывамі. Такія радкі сустракаюцца ў вершы «Літвінка»: *«Дачакаюся нядзелі, //* ***Памаліўшыся ў касцёле****, // У адзенні новым зранку // Я спяшаю на гулянку»* [6, с. 349], а таксама ў вершаваным апавяданні «Благаславёная сям'я»: *«У старога з вачэй слёз пальецца багата, // І, глядзіш, ён яшчэ ёй дабавіць дукатаў. //* ***І з пашанаю тут прыгадае ён Бога****, // І з удзячнасцю грудзі ўздыхнуць у старога»* [4, с. 157]; *«Час ляціць, калі ў працы нам Бог памагае»* [4, с. 158].

**Заключэнне.** Калі прааналізаваць біяграфію мастака слова і яго творчую працу, можна заўважыць, як праяўляецца вобраз аўтара ў яго творах. У паэтычнай спадчыне Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча дадзены вобраз праяўляецца ў імёнах герояў, сродках мастацкай выразнасці і эмацыянальным настроі ўвогуле. Вобраз аўтара ў паэзіі класіка беларускай літаратуры адметны менавіта патрыятычнымі пачуццямі, замілаванасцю да роднай прыроды.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Гісторыя беларускай літаратуры: XIX — пачатак XX ст. / рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.] ; пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. — Мінск : Выш. шк., 1998. — 560 с.
2. *Рагойша, В. П.* Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. — 3-е выд., дапрац. і дап. — Мінск : Беларус. навука, 2004. — 576 с.
3. *Лазарук, М. А.* Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў : дапам. для настаўнікаў / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. — Мінск : Нар. асвета, 1983. — 191 с.
4. *Дунін-Марцінкевіч, В.* Выбраныя творы : для сярэд. і стар. шк. ўзросту / В. Дунін-Марцінкевіч. — Мінск : Маст. літ., 2001. — 239 с.
5. *Яцухна, В. І.* Тэорыя літаратуры : дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ / В. І. Яцухна. — Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. — 279 с.
6. *Дунін-Марцінкевіч, В.* Збор твораў : у 2 т. / В. Дунін-Марцінкевіч ; уклад. з тэкст. падрыхт., пер. Я. Янушкевіча. — Мінск : Маст. літ., 2008. — Т. 2 : Вершаваныя аповесці і апавяданні, вершы, публіцыстыка, лісты і пасланні, пераклады. — 598 с.



УДК 811.612.91+811.161.1'373.45



**Хань Чан Динь Ньат**

*Учреждение образования «Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники»,*
*Минск, Республика Беларусь*


## ОСОБЕННОСТИ КОМПЬЮТЕРНОЙ ЛЕКСИКИ В РУССКОМ И ВЬЕТНАМСКОМ ЯЗЫКАХ

**Введение.** В любом языке терминология из разных сфер профессиональной деятельности имеет различные источники пополнения. Во-первых, она формируется на основе лексики общелитературного языка, во-вторых, может заимствовать терминологию других отраслей знания либо уже сформированные терминологии других языков. Специфика компьютерной терминологии как русского, так и вьетнамского языка в том,


© Чан Динь Ньат Хань, 2020



Репозиторий БарГУ